разным. Если большевики после победы Октябрьской революции рассматривали федерацию как необходимую форму государственного устройства страны на пути к полному единству, то федералистские идеи левых эсеров сводились в конечном итоге к широкой децентрализации власти. В левоэсеровской интерпретации это означало создание массы областей, совершенно самостоятельных, не связанных между собой, что вело в условиях разгоравшейся классовой борьбы к ослаблению централизованных начал Советской власти. Принцип "свободной федерации" давал возможность любой области или даже уезду объявлять себя суверенной республикой, кромсая Россию на кар...ковые территориальные образования. Несмотря на общую принципиальную слабость подобных идей для тех сложных условий, в них, на наш взгляд, содержались рациональные альтернативы зарождавшимся советским бюрократическим, централистским искажениям. Не случайно дискуссии по этим вопросам приобретали острейший характер.

К сожалению, летом 1918 г. произошел окончательный разрыв между большевиками и левыми эсерами. Вина за такой поворот лежит на руководителях обеих партий, хотя большую ответственность за такой исход, на наш взгляд, несут большевистские вожди.

ББК 63.3(2Б)

Н.М.Якуш, дацэнт

## КАНФЕСІЙНЫ ЎПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Хаця этымалагічна паняцці "этнас" і "нацыя" супадаюць, па сутнасці яны вызначаюцца рознымі ўзроўнямі сістэмна-сацыяльнай арганізацыі ў межах вялікіх груповак людзей. Дамінантай паняцця "этнас" выступае моўна-культурна-псіхалагічная агульнасць, а ў паняцці "нацыя" яна ўзбагачаецца кампанентай палітычна-тэрытарыяльнага і ідэйнага адзінства.

Веравучэнні, царкоўная арганізацыя сталі, з аднаго боку, тым фактарам, які спрыяў канчатковаму станаўленню этнічнай свядомасці. З другога боку, перарастанне этнічнай свядомасці ў нацыянальную таксама адбывалася пад адчувальным канфесійным уплывам, хаця яна і звязана з пераходам грамадства да свецкіх форм культурнага жыцця.

У 989 г. усходнеславянскія землі прынялі хрысціянства ў яго усходнеправаслаўнай форме. Праваслаўе лагічна і лёгка ўпляталася ў быт, традыцыю славян, паколькі ўвесь культ гэтай канфесіі быў звязаны з зямлёю. Кірыламяфодзіеўская традыцыя прызнавала права кожнага народа маліцца Богу і мець літаратуру на сваёй мове. Праўда, царкоўнаславянская мова зацвердзілася як бо-

гаслужэбная ўсіх праваслаўных славян, а таксама як кніжная. У пэўны час гэта становіцца перешкодай на шляху развіцця нацыянальнай мовы і свядомасці. А ў XI ст. пашыралася хрысціянская тэрміналогія, хрысціянскія антрапанімы, хрысціянска-праваслаўная ідэя літургічнай сузіральнасці нябёсаў і гармоніі дзяржаўнай і духоўнай улады. Гэтая канцэпцыя арганізацыі грамадскага жыцця, бясспрэчна, засталася састаўной часткай менталітэту беларусаў.

З нагоды адарванасці праваслаўнай дактрыны ад зямных рэалій на карысць Царства Божага многія лічаць праваслаўную царкву няздольнай арганізаваць дзейнасць на карысць нацыянальна-дзяржаўнай ідэі. Падаецца, што гэта не так. Усходняе хрысціянства сфарміравала спецыфічную ўнутраную структуру, асновай якой з'яўляецца аўтакефалія (незалежнасць) мясцовых цэркваў пры захаванні ганаровага першынства, у адпаведнасці з прынцыпам "першы сярод роўных" за патрыярхам Канстанцінопаля. Такая структура значна аблягчае станаўленне нацыянальна-дзяржаўнай царквы. Што датычыцца канцэпцыі грамадскага жыцця, то ўжо ў Сярэднявеччы Набажэнствы па-іншаму трактавалі і яе, і праблему грамадзянскага адзінства. Царкоўныя брацтвы, якія напачатку насілі рамесна-рэлігійны характар, - вынік значнага свецкага ўплыву на царкоўнае жыццё. Гуманістычны змест адукацыі брацкіх школ таксама падцвярджае гэта.

У перыяд з 1458 г. праваслаўная царква на Беларусі арганізацыйна разрывае з маскоўскай мітраполіяй і атрымлівае магчымасць развівацца ў нацыянальным кірунку. Але гэтыя магчымасці былі абарваны працэсамі Рэфармацыі, Контррэфармацыі і актамі Люблінскай дзяржаўнай і Берасцейскай царкоўнай уніі. Пасля аднаўлення праваслаўнай беларускай іерархіі і яе падпарадкавання маскоўскаму патрыярху (а затым Сіноду) праваслаўе на Беларусі становіцца сінонімам рускасці, а затым афіцыйнасці.

Пасля заключэння Крэўскай уніі ў межах Вялікага княства Літоўскага з'явілася другая хрысціянская канфессія - рымска-каталіцкая. Яе канцэпцыя хрысціянскага свету - канцэпцыя адзінства, у разуменні адзінства палітычнае, і да рэалізацыі гэтай ідэі была далучана палітычная ўлада. Заходняе хрысціянства рабіла стаўку на карысць дзяржавы, добра забяспечанай у гістарычным плане. Уся царква была падпарадкавана ўладзе папы з адначасовым імкненнем да падпарадкавання свецкіх улад вярхоўнай духоўнай уладзе.

У культурным плане рымскі каталіцызм выцясніў духоўную культуру, што мела дахрысціянскія вытокі. Касцёл павялічваў дыстанцыю паміж асобай і так званым светам духу, узмацніў яе шанцы на грамадскую актыўнасць. Устойлівая прысутнасць у лацінскай культуры персаналій у якасці каштоўных вартасцей спрыяла нацыятворчым працэсам. Але пасля заключэння Люблінскай уніі, у эпоху Контррэфармацыі, якая ажыццяўлялася на Беларусі па ініцыятыве поль-

скага каталіцкага духавенства і езуітаў, рымска-каталіцкі касцёл на Беларусі паланізаваўся. Разам з ім наступала польская культурная традыцыя. Праўда, ва ўмовах змяншэння ролі канфесійнага фактару ў жыцці грамадства і ўзрастанні палітычных рухаў у XIX ст. касцёл, не звязаны афіцыйнай ідэалогіяй царызму, даваў стымул для апазіцыйнай дзейнасці ў галіне культуры. Не выпадкова практычна ўсе беларускія пісьменнікі і іншыя нацыянальныя дзеячы XIX ст. былі па веравызнанні каталікамі. Сярод дзеячоў нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст. таксама пераважалі каталікі (Я.Купала, Цётка, В.Ластоўскі, Іван і Антон Луцкевічы, К.Каганец і інш.). І ўсё ж гэта адзінкі. Для масавай свядомасці грамадска-каталіцкая тэалагічная думка ў плане нацыянальнай ідэі на Беларусі не працавала.

Цікавая сітуацыя выкрэслілася з распаўсюджваннем на беларускіх землях уніяцтва. Палітычныя падзеі XУIII ст. прывялі да таго, што уніяцкая царква стала адзінай царквой беларусаў і украінцаў у Рэчы Паспалітай. Падаецца, што ў перспектыве пры спрыяльных умовах яна магла выступіць у якасці чынніка нацыянальнага адраджэння. Але ў XIX ст. уніяцкая царква на Беларусі была ўжо уцягнута ў проціборства праваслаўнай царквы і рымскага касцёла. Яна не мела сваёй палітычнай канцэпцыі грамадскай арганізацыі, не мела своеасаблівай тэалагічнай ідэі і за перыяд функцыянавання не ўзняла вернікаў на ступень свядомасці, вышэйшую за этнічную. Проціпастаўленне уніятаў палякам і рускім ішло па прынцыпе "мы уніяты, ці тутэйшыя". І наогул, вывад аб яе нацыянальным характары робіцца на аснове падзей пачатку XIX ст., калі гэтая канфесія рабіла спробу ўзяць своеасаблівы рэванш, выстаяць перад напорам праваслаўя, а таму аказалася грамадска актыўнай.

ББК 63.3(2Б)

В.С.Лявоненка, асістэнт

## УПЛЫЎ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ НА РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ БЕЛАРУСІ Ў 70-я ГАДЫ XX ст.

Інтэнсіфікацыя прамысловага комплексу рэспублікі ў адзначаны час была немагчыма без усямернага развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, укаранення ў практыку дасягненняў навукі. Партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам БССР у 70-я гады было зроблена шмат у гэтым накірунку. Так, 27 жніўня 1971 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР "Аб мерах па паскарэнні ўкаранення ў народную гаспадарку вынікаў навукова-даследчых работ інстытутаў Аддзялення фізіка-тэхнічных навук АН БССР і іншых устаноў рэспублікі". У пастанове былі вызначаны комплексныя навукова-тэхнічныя праблемы на 1971-